# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА В. З. ХАРУЖАЙ



**В. З. Харужая, кіраўнік групы**

**Перыяд дзеяння:**

27 верасня – 13 лістапада 1942 г.

**Месца дзеяння:**

г. Віцебск

**Колькасць:**

18 чалавек

**Кіраўнікі:**

Харужая Вера Захараўна («Г. С. Карнілава»)

Рашэннем ЦК КП(б)Б у верасні 1942 г. у Віцебск са спецыяльным заданнем накіравана група з 18 чалавек на чале з В. З. Харужай («Г. С. Карнілавай»). У яе ўваходзілі С. С. Панкова, Е. С. Суранава, А. Ф. Ермаковіч, А. П. Іванькова і інш.

Віцебск знаходзіўся ў прыфрантавой паласе на галоўным напрамку 3-ай і 4-ай ударных армій Калінінскага фронту, таму патрабаваліся дакладная інфармацыя аб праціўніку, правільная ацэнка падзей на месцы і выбар метадаў барацьбы.

Па прычыне таго, што адказны арганізатар Віцебскага абкама КП(б)Б, шматлікія кіраўнікі камсамольскага падполля, спецгрупы Чырвонай арміі і аператыўна-чэкісцкія групы, пад камандаваннем якіх працавалі падпольшчыкі, знаходзіліся ў размяшчэнні партызанскіх брыгад, на Харужую была ўскладзена задача па кіраўніцтве падполлем горада.

20 верасня 1942 г. Вера Харужая, Тоня Ермаковіч (Узкая), Дуся Суранава ступілі на партызанскую зямлю ў размяшчэнні 1-ай Беларускай партызанскай брыгады М. П. Шмырова. Астатняя частка групы засталася на Вялікай зямлі, у прыфрантавой паласе, у распараджэнні Віцебскага абкама партыі.

27 верасня партызанская сувязная Клаўдзія Балдачова («Бяроза») прывяла ў горад да Вараб’ёвых Е. С. Суранаву і А. Ф. Ермаковіч (вул. Трактарная, 4). Вараб’ёвы былі сваякамі Е. С. Суранавай, таму пасланцаў з Вялікай зямлі яны прынялі ветліва і сардэчна. Вырашылі не марудзіць з выкананнем задання і ў той жа дзень прыступілі да справы. Клава Балдачова накіравалася да знаёмых «кітайцаў» (так называлі падпольную групу А. І. Ліпці, якая аб’ядноўвала мясцовых жыхароў кітайскай нацыянальнасці). Дуся Суранава і Тоня Ермаковіч наведалі сям’ю даваеннага сакратара партыйнай арганізацыі фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», а цяпер інструктара падпольнага абкама КП(б)Б М. І. Мацэнка, і сясцёр Аляксандру і Ефрасінню Волат, якія пражывалі па Гутараўскай, 33 (цяпер праспект Люднікава).

Так былі ўстаноўлены першыя сувязі Харужай у віцебскім падполлі. 1 кастрычніка 1942 г. у Віцебск прыбыла і Вера Харужая ў суправаджэнні Тоні Ермаковіч, якая прыступіла да выканання ролі сувязной. Яшчэ ў дарозе Вера зразумела, што іх дакументы не вытрымаюць сур’ёзнай праверкі, а абставіны значна складаней, чым бачыліся тым, хто накіроўваў яе ў горад. Адрасы жыхароў і падпольшчыкаў горада, якія Вера Захараўна атрымала ад Кудзінава і сабрала сама сярод партызан, мелі шматлікія прагалы. Патрабавалася самая ўважлівая і асцярожная праверка адрасоў і людзей. Усё гэта вымагала пэўнага часу і ўмоў. На жаль, умоў у іх не было ніякіх, ды і час не чакаў. Вера Харужая з Дусяй Суранавай самі хадзілі па адрасах, знаёміліся з людзьмі, вывучалі акупацыйны рэжым.

Асноўным месцам сустрэч Веры і Дусі была кватэра Вараб'ёвых. Асабліва пяшчотна Вера пісала пра гаспадыню дома – Марыю Ігнатаўну («Бабуля Маша»). Яе сын Васіль Сямёнавіч працаваў на хлебазаводзе, а яго стрыечны брат Мікалай Вараб'ёў – на тэлефоннай станцыі, побач з якой размяшчаўся варожы радыёвузел. Браты забяспечвалі Веру інфармацыяй з гэтых цікавых для разведчыц аб'ектаў.

У сям'і Мацэнка адбылося вельмі карыснае знаёмства з камуністкай Марыяй Іванаўнай Гульбе, мясцовай жыхаркай латышскай нацыянальнасці, якая добра ведала нямецкую мову і мела надзейныя дакументы. Брат Мацэнка, які працаваў на чыгунцы і інфармаваў Веру пра становішча на ёй, расказваў, што Харужая і Гульбе адразу пасябравалі і пры сустрэчах падоўгу гутарылі ў падвале дома па вул. Грыбаедава, 14, дзе месцілася сям'я Мацэнка. Цэлымі днямі хадзіла Гульбе па горадзе, наведвала сваіх знаёмых, асабліва тых, хто працаваў у акупацыйным апараце, заходзіла ў розныя ўстановы і да канца дня мела шмат цікавых назіранняў.

Вельмі чула адносілася Вера да Матроны Кліменцеўны Оскер, якая ў сваю чаргу плаціла Харужай тым жа, – самаадданa выконвала даручэнні Веры. Брат М. К. Оскер быў камісарам аднаго з партызанскіх атрадаў, пляменніца Венера – армейскай разведчыцай, а сама Матрона Кліменцеўна ўжо набыла вопыт падпольнай работы ў групе К. С. Акаловіч. Сціплая краўчыха-інвалід не выклікала асаблівых падазрэнняў у акупантаў, і яе кватэра па 2-й Ногіна, 18 (або 5-я Вінчэўскага, 16) стала надзейнай паштовай скрынкай для падпольшчыкаў.

Каштоўныя звесткі паступалі ад групы А. І. Ліпці, якая дзейнічала ў пральні па вуліцы Леніна. З яе вокнаў падпольшчыкі сачылі за перамяшчэннем транспарту па цэнтральнай вуліцы горада, за ўправай і паліцыяй, памяшканні якіх знаходзіліся якраз насупраць пральні. Але галоўным было тое, што па маркіроўцы бялізны і па накладных патрыёты вызначалі нумар і месца дыслакацыі, а таксама прыблізны колькасны склад воінскіх часцей, якія здавалі бялізну для мыцця.

Некаторыя сувязі Харужай, пра якія ўпамінаецца ў пісьмах, да сённяшняга дня раскрыць не ўдалося, паколькі пэўныя прозвішчы пазначаны толькі пачатковымі літарамі. Не ведаем, напрыклад, хто такія Азолавы, якім Вера перадае прывітанне; жанчына пад псеўданімам «Зорачка», якую безвынікова шукала Вера; да каго хадзілі Харужая і Ермаковіч на вуліцу Пясчаную... Вядома, што з чыгуначнага вузла да Веры паступілі звесткі ад падпольнай групы «Радзіма», якая налічвала каля 30 чалавек. Ніхто з групы «Радзіма» так і не адгукнуўся на публікацыі, у якіх ішла размова пра іх згуртаванне.

Харужая добра ўсведамляла, што накіравана ў Віцебск, каб узначаліць усё падполле, таму дзейнічала ў адпаведнасці з заданнем. Ёю быў створаны кіруючы цэнтр,

куды паступала інфармацыя амаль з усіх канцоў горада і з найбольш важных аб’ектаў ворага. Назва ж «група Харужай» тычыцца той часткі жанчын, якія выехалі разам з Верай з Масквы і прыбылі ў Віцебскі абкам партыі. В. З. Харужая была вопытным і ўмелым канспіратарам.

Пра падпольшчыкаў даведалася здрадніца Ганна Васільева. 13 лістапада 1942 г. сувязная Балдачова прывяла для сустрэчы з Харужай Соф’ю Сяргееўну Панкову. Калі гэтая інфармацыя стала вядома Васільевай, яна адразу ж данесла ў СД, што ў Вараб’ёвых сабраліся падпольшчыкі. У лапы ворага папалі Вера Харужая, Еўдакія Суранава, Соф’я Панкова, Клаўдзія Балдачова, гаспадыня кватэры Марыя Ігнатаўна («Бабуля Маша»), яе нявестка Агаф’я Максімаўна, жонка сына. Васіля Вараб’ёва арыштавалі на рабоце. Каб адвесці падазрэнні, фашысты забралі і даносчыцу Ганну Васільеву, але праз некалькі дзён выпусцілі. На допытах яна расказала ўсё, што ведала пра падполле. Больш за месяц арыштаваных трымалі ў гарадской турме і засценках СД.

4 снежня 1942 года, узятыя з розных камер а 6-й гадзіне раніцы, Вера Харужая, Соф’я Панкова, Дуся Суранава, Клава Балдачова (Шадурская) і трое Вараб’ёвых былі расстраляны ў лагеры ваеннапалонных на тэрыторыі былога 5-га Чыгуначнага палка. Чаму там? Па вельмі простай прычыне. Кожны дзень у лагеры паміралі шмат людзей, і ўвесь час былі адкрытымі свежавыкапаныя ямы, у любую хвіліну гатовыя прыняць новыя ахвяры.

17 мая 1960 года Веры Захараўне Харужай пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У Віцебску адна з вуліц (былая Трактарная) і СШ № 19 носяць яе імя. У двары сярэдняй школы № 31 устаноўлены бюст Харужай.






**Бюст В. З. Харужай работы З. Азгура у двары СШ № 31, г. Віцебск**
Крыніца фотаздымка: http://evitebsk.com

**Мемарыяльная дошка на доме па вул. В. Харужай, 19, г. Віцебск.**
Крыніца фотаздымка: http://evitebsk.com

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Вера Хоружая** в Витебске // Витебское подполье / Н. И. Пахомов, Н. И. Дорофеенко, Н. В. Дорофеенко. – Минск, 1969. – С. 90–104.
2. **Дарафеенка, Н. І.** Аб Веры Харужай – новае слова / Н. І. Дарафеенка // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць : матэрыялы навук.-практ. канф., Віцебск, 18–19 чэрв. 2009 г. / рэдкал.: В. У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2009. – С. 110–117.
3. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Харужай В. З. / Н. І. Дарафеенка, М. У. Дарафеенка // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1990. – С. 131.
4. **Дарафеенка, Н. І.** Подзвіг Веры Харужай у Віцебску / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 471–478.
5. **Подпольный** партийный центр // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 298–300.